УДК 727.012

# АНАЛІЗ УСТАНОЎ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ ГОРАДА БАРЫСАВА

Чабатар Д. А.
*Навуковы кіраўнік – Касцяшоў А. В.*
Беларускі Нацыянальны Тэхнічны Універсітэт
Мінск, Беларусь.

Зараз адбываецца мадэрнізацыя школьнай адукацыі ва ўсіх яе сферах, у т. л. і ў сферы архітэктурнага асяроддзя. Але на сённяшні момант большасць школ пабудавана за савецкім часам і валодаюць пэўным пералікам праблем, каторыя нам, як будучым архітэктарам, трэба будзе вырашаць.

За прыклад я вылучыў крупны прамысловы горад у Мінскай вобласці – Барысаў.

На дадзены момант у горадзе Барысаве знаходзіцца 20 установ сярэдняй адукацыі, з якіх 19 пабудавана ў XX стагоддзі (Выява 1).




Выява 1. Мапа школ горада Барысава

Дзеля таго каб выявіць праблемы каторыя мы як архітэктары можам вырашыць, неабходна скласці пералік крытэрыяў па каторым будзе магчыма выявіць спіс праблем.

Сярод крытэрыяў я вылучыў наступныя:

- *Дасягненні вучняў* – гэты крытэрый дэманструе вынікі вучняў у алімпіядах і ў па-за школьных мерапрыемствах.
- *Матэрыяльна-тэхнічная база* – паказвае стан абсталявання школ.
- *Унікальныя магчымасці* – паказвае колькасць магчымасцяў для развіцця вучняў па-за межамі школьнай праграмы.
- *Гістарычнасць* – гэты крытэрый паказвае як гісторыя школы выяўляецца ў дызайне памяшканняў і тэрыторыі.
- *Адаптыўны дызайн* – паказвае стан унутранага асяроддзя школ і іх прывабнасць
- *Школьны двор* – гэты фактар паказвае стан школьнага двара.

Ацэньванне адбывалася па наступнай шкале дзе 4 – гэта выдатна, 1 – дрэнна і 0 – няма інфармацыі.

Аналізуючы школы можна выявіць пэўны пералік тыповых праблем каторыя я буду разглядаць на прыкладзе сярэдняй школы №8 (Выява 2). Разглядаць я буду крытэрыі каторыя непасрэдна звязаны з архітэктурай: «адаптыўны дызайн», «школьны двор», «гістарычнасць».




Выява 2. Вынік аналізу СШ №8 г. Барысава

*Адаптыўны дызайн.* Калідоры і кабінеты не прывабныя, адсутнічае безбар"ернае асяроддзе, а так жа месцы для калектыўнага і індывідуальнага адпачынку і працы.

*Школьны двор.* Дрэнны стан спартыўных пляцовак і адсутнасць месцаў для адпачынку і працы робіць школьны двор менее прывабным і разбурае знешняе аблічча школы. Шмат тэрыторый не задзейнічана. Пры гэтым школа валодае багатым азеляненнем.

*Гістарычнасць.* Школа мае стогадовую гісторыю, але цяперашні будынак школы быў пабудаваны ў 1976 годзе па тыповым праэкце. У школе існуе музей аб яе гісторыі, але пры гэтым гісторыя школы не выяўляецца ў знешняй архітэктуры і унутранай прасторы.

Дадзены пералік праблем тыповы для кожнай школы пабудаванай за савецкім і не толькі часам.

Прыведзеныя ніжэй ідэі дазволяць толькі часткова палепшыць сітуацыю:

- *Адаптыўны дызайн.* Неабходна стварэнне ўмоў для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Калідоры і кабінеты павінны быць афарбаваны у прыемныя і светлыя колеры. У класах павінен існаваць падзел на функцыянальныя зоны: тэарэтычную і практычную, а так жа аб"ядноўваць кабінеты ў крылах школы пад адну функцыянальную частку: хімічна-біялагічная, фізіка-матэматычная і інш.
- *Школьны двор.* На школьнай тэрыторыі можна рэалізаваць наступныя ідэі: «зялёныя класы» - гэта месца для практычных заняткаў па біялогіі і геаграфіі. Павільёны і альтанкі – месцы для правядзення ўсіх прадметаў на паветры, а так жа правядзення па-за школьных мерапрыемстваў. Месцы для адпачынку і індывідуальнай вучобы: крэслы, лаўкі, сталы і інш. Скейт-парк ці іншыя пляцоўкі для заняткаў папулярнымі відамі спорту сярод вучняў.
- *Гістарычнасць.* Павялічэнне адлюстравання гісторыі школы ў яе нутраным ды знешнім абліччы праз стэнды, муралы і інш. Вяртанне гістарычнага аблічча шляхам пошукаў гэтага аблічча з дапамогай вучняў школы.

Але ўсё гэта толькі магчымыя ідэі, каторыя могуць і не скарыстацца попытам вучняў. Надзейным інструментам для вырашэння як тыповых так і індывідуальных праблем з"яўляецца сумеснае праэктаванне.

Дзеці з"яўляюцца галоўным спажыўцамі школьных прастор і праводзяць там значную частку свайго дня. Але пры гэтым пры праэктаванні іх меркаванне не ўлічваецца. Як вынік – незапатрабаваныя і дрэнныя прасторы.

Сумеснае праэктаванне дазваляе не толькі дзецям выказацца наконт таго якім будзе абноўленая прастора. У гэтым працэсе могуць і павінны ўдзельнічаць усе бакі спажывання: дзеці, бацькі, настаўнікі, адміністрацыя і, канешне, архітэктары.

Сумеснае праэктаванне адбываецца па наступнай схеме:

Інфармаванне → Праца з запытам → Пошук ідэй → Фарсайт-праэкт → Тэстыроўка ідэй распрацоўка праэктнай дакументацыі → Узгадненне праэкту → Рэалізацыя [1].

- *Інфармаванне.* Для таго каб кожны ўдзельнік мог даведацца аб правядзенні праэкту і мог прыяднацца да гэтага праэкту.
- *Праца з запытам.* Складанне для ўдзельнікаў тэхнічнага задання на праэктаванне ўсім школьным таварыствам. Трэба даць права агучыць удзельнікам патрэбы і праблемы.
- *Пошук ідэй.* Удзельнікі генерыруюць свае ідэі зыходзячы з праблем і патрабаванняў.
- *Фарсайт-праэкт.* Збор усіх ідэй у адну цэльную канцэпцыю.

- *Тэстыроўка ідэі.* Ідэі фарсайт-праэкту патрабуюць тэстыроўкі – бо магчыма, яны добра працуюць на паперы але не працуюць ці не спрацуюць у рэальным жыцці альбо патрабуюць зменаў.
- *Распрацоўка дакументацыі.* На гэтым этапе ўсю працу выконваюць пэўныя спецыялісты, але і тут удзельнікі могуць ці нават павінны азнаямляцца з ходам праэкту каб адсочваць яго выкананне ад пачатку і да канца.
- *Рэалізацыя.* Некаторыя нескладаныя і бяспечныя працы могуць выконваць усе ўдзельнікі праэкту.

Такім чынам асноўны фонд устаноў сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь складаюць будынкі пабудаваныя ў дваццатым стагоддзі. Якія маюць свае тыповыя і індывідуальныя праблемы, сярод якіх: непрывабнае ўнутранае асяроддзе дзе адсутнічае камфортная мэбля для індывідуальнага адпачынку і вучобы, школьная тэрыторыя дрэнна абсталявана, ды часта ўвогуле не абсталявана. Гэтыя праблемы могуць і нават павінны вырашацца пры дапамозе сумеснага праэктавання ўсіх удзельнікаў працэсу адукацыі: вучняў, бацькоў, настаўніка, адміністрацыі пры непасрэдным куратарстве архітэктараў.

*Літаратура*

1. Как спроектировать школьный двор : соучаствующее проектирование с детьми и школьным сообществом. Идеи для руководителей / Т. Ле-ван, Б. Филатова, А. Якшина. — М. : Изд-во «Экон-Информ», 2021. — 58 с.

2. Руководство по оформлению школ / А. Лебедев и др. — Москва, студия А. Лебедева совместно с МархИ, 2016 — 1126 с.

3. «Народное образование»: Архитектура школы будущего: среда обучения. / — Москва, Российский университет дружбы народов, Я. В. Куваева — 8 с.

4. «Ведомости»: Чему учит здание школы: архитектура как фактор успешного образования. [Электронный ресурс] — Режим доступа: https://www.vedomosti.ru/society/articles/2020/10/05/842186-chemu-zdanie Дата доступа 13. 06.2023

5. «РИА Новости»: Школьная революция: архитекторы против советского образования. [Электронный ресурс] — Режим доступа: https://ria.ru/20170222/1488127714.html Дата доступа: 13.06.2023

6. Большая перемена: Новые подходы к проектированию школ. [Электронный ресурс] — Режим доступа: https://prorus.ru/interviews/bolshaya-peremena-novye-podhody-k-proektirovaniyu-shkol/ Дата доступа: 13.06.2023